Лобач Уладзімір
г. Новополоцк

# НЕКАТОРЫЯ ВЫНІКІ ЭТНАГРАФІЧНЫХ ДАСЬЛЕДВАНЬНЯЎ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗЬВІНЬННЯ (ЭКСПЕДЫЦЫІ ПДУ 1995-1997 гг.)

На сёньняшні дзень ПДУ з'яўляецца адзіным дзяржаўным універсітэтам Беларусі, які разам з археалагічнай практыкай студэнтаў-гісторыкаў праводзіць штогадовыя этнаграфічныя экспедыцыі. За 1995-1997 гг. палявыя этнаграфічныя дасьледваньні праводзіліся ў Верхнядзьвінскім, Бешанковіцкім, Мёрскім і Ушацкім раёнах. Экспедыцыі дазволілі назапасіць вялікі аб'ём навукова значнай інфармацыі (каляндарна-абрадавы фальклёр, народны эпас, вераньні, знахарства і г.д.), але з другога боку высьвятлілі шэраг праблемаў.

Напрыканцы XX ст. даволі спрэчным з'яўляёцца існаваньне «клясічнай» этнаграфіі, узору XIX - п.XX ст. Элементарнее апісанне культурнай сітуацыі сучаснай вёскі ўжо мала што можа даць дасьледчыку. Гэта звязана з тым, што традыцыйная беларуская культура сёньня ўжо не ўяўляе сабой суцэльнае культурнее непарыўнсьці. Другая Сусьветная вайна, прымусовая калектывізацыя і рэпрэсіі, імклівыя працэсы урбанізацыі 1960 - 1980-х гадоў нанесьлі непапраўныя страты механізму традыцыйнага самаўзнаўленьня (у т.л. і механізму міжпакаленнай трансьляцыі культурнай традыцыі). Не выпадкова, што асноўнымі інфарматарамі з'яўляюцца людзі 1910 - 1920-х гадоў нараджэньня.

Такім чынам, пры безумоўнай неабходнасьці фіксаваць фальклёр і зьбіраць узоры матэр'яльнай культуры - гэта ўжо ня можа быць самамэтай палявога дасьледчыка.

Тая прыкрая акалічнасць, што пакаленьне людзей, валодаючых найбольш каштоўнай інфармацыяй, незваротна сыходзіць у нябыт, вымагае шырокіх міждысцыплінарных (комплексных) дасьледваньняў. Этнографа-археалягічная дыягностыка, этнасацыялёгія, этнаэкалёгія, візуальная антрапалёгія і этнапсіхалёгія - мусяць стаць асноўнымі накірункамі дзейнасьці палявых дасьледчыцкіх труп. Не гаворачы пра тое, што зафіксаваны матар'ял мусіць перапрацоўвацца і аналізавацца на ўзроўні стварэння кампутарнай базы дадзеных.

Недахоп сродкаў і амаль поўная адсутнасць абсталяваньня пакуль робіць недасяжнай выкананьне акрэсленых пазіцый для этнаграфічнай экспедыцыі ПДУ.

Тым ня менш, былі зроблены спробы («этнаграфічная шурфоўка») у галіне этнаархеалягічнай дыягностыкі, псіхалёгіі, рэлігіі і нек. інш. накірунках міждысцыплінарных дасьледваньняў.

Археалягічная карта Беларускага Падзьвіньня й дагэтуль мае даволі шмат белых плямаў. Яшчэ ў большай меры гэта датычыцца сакральных аб'ектаў дахрысціянскае эпохі. І найгалоўным чыньнікам у іх лакалязацыі выступав менавіта этнаграфічная інфармацыя. Дыягнастычную шкалу магчыма прадставіць такім чынам: а) тапонім (назва аб'екта); б) мясцовая лягенда (паданьне) адносна аб'екта; в) геаландшафтная характарыстыка аб'екта (пагорак, возера, камень; памеры, стан захаванасьці і т.д.); г) гісторыка-культурная паралелі адносна аб'екта; д) археалягічны пошук.

Не маючы магчымасьці праводзіць археалягічныя раскопкі, Полацкая этнаграфічная экспедыцыя, тым ня менш, выявіла шэраг аб'ектаў, якія з вялікай доляй верагоднасьці з'яўляліся сакральнымі аб'ектамі дахрысьціянскай эпохі.

Перш за ўсё, увагу прыцягвалі прыродныя аб'екты, меўшыя сакральный (рытуальныя) функцыі ў недалёкім мінулым. У прыватнсьці - мейсцы сьвяткаваньня Купальля. Як правіла, калі гэта дазвалялі ландшафтныя ўмовы, Купальскі абрад спраўляўся на гары (пагорку). гэта не выпадкова, бо ў міталягічным сьветаўспрыняцьці «гара выступав ў якасьці найбольш распаўсюджанага варыянта трансфармацыі сусьветнага дрэва. Гара успрымаецца, як мадэль Сусьвету, у якой адлюстраваныя ўсе асноўныя элементы і параметры касьмічнага парадку». /1; 311/. Пра сакральнае ўшанаваньне гор беларусамі яшчэ ў XVI ст. пісаў і Міхалон Ліцьвін /2; 86/. Вельмі цікавым аб'ектам у згаданым кантэксьце з'яўляецца «Дароціна гара», выяўленая экспедыцыяй ПДУ у 1995 г. ля в. Канчаны Верхнядзьвінскага раёну. Невялікае, часткова разаранае узвышша, ля падэшвы якога знаходзіцца маленькае возера, у мясцовай традыцыі трывала звязваецца з валатоўнай Даротаю. Паводле паданьняў гэта была жанчына неверагоднае моцы, якая на Купальле (!) перакідвалася бярвеньнямі з «калдуньняй Княгіняй», што шла на «Піруновай гары» (!) на высьпе Асьвейскага возера (адлегласьць паміж аб'ектамі сягае 5 км). Прыцягвае ўвагу той факт, што «Пірунова гара», гэта нішто іншае, як невялікае гарадзішча Днепрадзьвінскай культуры. Гэтая акалічнасьць дазваляе меркаваць, што Дароціна гара мела пэўны (сакральны?) статус у мясцовага насельніцтва ўжо ў эпоху Раньняга Жалезнага веку.

Але самае знамянальнае, што, паводле паданьняў, Дарота з'яўлялася «жанчынай-воінам», якая змагалася ў нейкую вайну і загінула (версія - пахаваная) на гары[173]. Гэты цікавы сюжэт знаходзіць

---

[173] Запісана аўтарам у г.п.Асьвея ад Аржанік В.В., 1918 г.н.

свае паралелі на Крыўскай (Падзьвінскай) прасторы. Так, багатырка, што жыла на гары ля Расонаў, прыводзіць да згубы чужынскае (татарскае) войска, рэшта якога, уцякаючы, забівае яе і хавае на гары [3; 335]. Падобным чынам тлумачыцца і паходжаньне Бязьдзедавіцкіх і Вусьцянскіх Курганоў у Полацкім раёне: асілак Кацярына разьбівае войска чужаземца Батуры /3; 234/. Тэма вайны прасочваецца і ў паданьні, зьвязаным з Дзявочай горкай у Мсьціслаўлі, якую, нібыта, у якасьці ўмацаваньня насыпалі дзяўчаты за адну ноч /4; 342/. Тлумачэньні вобразу ваяўнічай валатоўны мы знаходзім у германскай ды кельцкскай міталёгіі. Так, адной з важнейшых ірлянскіх багіняў з'яўлялася багіня ваайны і разбурэньня - Morrigan, чый вобраз таксама цесна суадносіўся з «чароўнымі пагоркамі» ірляндыі /5; 49/. Аналягічнымі ёй з'яўляюцца і скандынаўскія валькірыі і заходнегерманскія IDISI (Дзісы), ваяўнічыя дзевы-валатоўны, якія разьмяркоўваюць перамогі й смерць у бітвах.

Такім чынам, невялікая горка на Асьвейшчыне пры ўсебаковым аналізе фактуры, датычнае яе, можа выводзіць на дагэтуль незнаёмую старонку крыўскай міталёгіі, а менавіта, сьведчыць за існаваньне на гэтых землях культа багіні вайны. Дэталёвыя археалягічныя раскопкі мусяць верыфікаваць вышэйпададзенае меркаваньне.

Сярод іншых узвышшаў, якія фігуруюць у мясцовага насельніцтва, як трывалае мейсца сьвяткаваньня Купальскага абраду, цікавасць у археолагаў могуць выклікаць наступныя:

1) Лысая ці Сабач'я гара ў маёнтку графа Шадурскага (Асьвея), якая паводле паданьняў мае штучны характер і ў якой нібыта хавалі паляўнічых сабакаў графа (прыгадай міталягічны сюжэт: князь Бой і яго сабакі);

2) «Пірунова гара» у Пд. Частцы выспы Асьвейскага возера; гарадзішча днепра-дзьвінскай культуры; раскопкі дагэтуль не праводзіліся;

3) Гара Царкоўна (ля в. Сенькава Верхнядзьвінскага р-на), на якой паводле паданьня «Стаяла царква. Туды сабраліся на сьвята грэшныя людзі і яна правалілася пад зямлю» . Як правіла, падобныя паданьні даволі дакладна суадносяцца, калі і не з сакральнымі аб'ектамі старажытнасьці дык з археалягічнымі помнікамі жалезнага веку ці Раньняга Сярэдневечча;

4) Гара Купала (!) (ля в. Гарадзішча Мёрскага р-на); на сёньняшні момант ніякіх археалягічных помнікаў у наваколіцах вёскі не выяўлена (?);

5) Гара Красная (ля в. Буды Верхнядзьвінскага р-на); пагоркі з такой назвай даволі часта сустракаюцца і ў Бешанковіцкім раёне.

---

[174] Запісана аўтарам у в. Сенькава ад Марыінскай А.К., 1918 г.н.

На вялікі жаль частка падобных аб'ектаў не захавалася да нашага часу. Так, напрыклад, цалкам зрытая ў 1960-я гг. была Сьвятая гара (ля в. Стралкі Верхнядзьвінскага р-ну). Сакральнасьць гары вынікала з наяўнасьці на ёй сьвятой крыніцы, вада якой валодала, па перакананьні мясцовага жыхарства шырокім сьпектрам лекавых якасьцяў. Над крыніцай была пабудаваная капліца, куды людзі прыносілі ахфяры: кветкі, воўну, грошы. Апрача таго на гары расла вялізарная сасна, якая служыла эпіцэнтрам Купальскага абраду (на яе вяршыні размяшчалі «мазьніцу» - запаленае кола, загадзя абмазанае калёснай мазьзю). Падаецца невыпадковым, што на даволі блізкай адлегласці ад Сьвятой гары знаходзіцца Сьвятое возера. Не маючы прытокаў і вытокаў, невялікае, амаль круглае ў пляне возера славіцца на ўсю наваколіцу крыштальна чыстай вадой. За сакральны характер гэтага возера сьведчыць цэлы шэраг паданьняў:

а) Замест возера стаяла царква, якая правалілася;

б) «У сярэдзіне возера амут» (адлюстраваньне міталягічнай дарогі ў іншасьвет);

в) «У Сьвятым возеры вада лячэбная. Хто п'е - выздараўліваіць»[175];

г) Існаваньне забароны на лоўлю рыбы ў возеры і сьцірку ў ім (табуізацыя прафанных дзеяньняў адносна сакральнага аб'екту).

і найбольш каштоўнае сьведчаньне дазваляе падцьвердзіць храналягічную ўстойлівасць і дахрысьціянскую прыналежнасьць магчымага сьвяцілішча на беразе возера: «Возера Сьвятое называецца так, бо ў ім хрэсьцілі язычнікаў. Мне так яшчэ дзед казаў»[176]

Хрост паганцаў, як гэта паказваюць шырокія гістарычныя паралелі, здбываўся паралельна з «хростам» паганскіх сьвяцілішчаў (будаўніцтва цэркваў на мейсцы сьвяцілішча, высяканьне крыжоў на сьвятых камянях 1 г.д.) з гэтай мэтай, каб ранейшая сакральнасць аб'екта магла выкарыстоўвацца на карысьць царквы. Такім чынам ваколіцы возера патрабуюць сур'ёзнага археалягічнага вывучэньня. Гэтая неабходнасць падкрэсьліваецца і тым фактам, што менавіта на беразе Сьвятога возера (ля в. Ходасавічы Рагачоўскага р-на) у 1971 г. было выяўлена и раскапана паганскае сьвяцілішча X-XI стст.[177]

Безумоўна, вялікай праблемай для сучаснага дасьледчыка зяўляецца тое, што вялізарны пласт мікратапанімікі (а менавіта яна найбольш каштоўная для палявога дасьледчыка) незваротна згубленая. Перш за ўсё, гэта зьвязана з разбурэньнем сістэмы сельскіх паселішчаў (асабліва хутарскага тыпу). Аднак аналіз пісьмовых і этна-

---

[175] Запісана ў в. Стралкі Верхнядзьвінскага р-на ад Лучковай М.Ф., 1911 г.н.

[176] Запісана ў в. Абрамава Верхнедзьвінскага р-на ад Самусёнка М.В., 1936 г.н.

[177] Глядзі: Куза А.В., Соловьев Г.Ф. Языческое святилище в земле радимичей // Советская археология. - 1972. - № 1.

графічных крыніц можа даць каштоўную інфармацыю. Так, напрыклад, даволі плённа вывучэньнем беларускае мікратапаніміі займаліся у к.XIX - п.XX ст. Е.Раманаў і Т.Анікіевіч. Дасьледуючы Сеннінскі павет, Т.Анікеіевіч з дакладнымі прывязкамі да населеных пунктаў зафіксаваў 7 Лысых гор, 2 гары Царковішча, 2 Красныя гары, горы: Зьмяёўка, Княж'я, Дзедоўка, Цар-Лог, Замак ды інш. Ён жа адзначыў і наяўнасць 4-х Сьвятых вазёр 6 (сучасныя ж даведнікі падаюць толькі 2).

Такім чынам, карэляцыя гістарычных дадзеных з дадзенымі сучаснай археалёгіі, этнаграфіі, краязнаўства ды інш. Дысцыплін дазволіла б значна павысіць эфектыўнасць палявых пошукаў. Азначаны прынцып, на думку аутара, датычыцца ўсёй палявой дезйнасьці на тэрыторыі Беларусі і ў тым ліку этанграфічных экспедыцый ПДУ.

**Літаратура**


1. Топоров В.Н. Гора // Мифы народов мира. Т.1. - М., 1991
2. Литвин Михаил. О нравах татаров, литовцев и татар. - М., 1994.
3. Легенды і паданні. - Мн.: 1995.
4. Зайкоўскі Э. Дзявочая гара // Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя. - Мн., 1989.
5. Предания и мифы Средневековой Ирландии. - М., 1991.
6. Аникиевич Т. Описание Сенненского павета Могилёвской губернии. - Мн., 1907.